*Аляксандр Ярашэвіч*

# Бітва пад сценамі Мірскага замка 10-11 чэрвеня 1792 года

Вайна 1792 г. Расіі з Рэччу Паспалітай з'явілася "адказам" Кацярыны II на Чатырохгадовы сойм 1788-1792 гг., які паспрабаваў рашуча рэфармавацць грамадска-палітычны лад дзяржавы на глебе асветніцкіх ідэй, пазбавіцца ад навязанай апекі Расійскай імперыяй, павялічыць войска (да 100 тысяч). Канстытуцыя 3 мая 1791 г. вельмі насцярожыла суседнія манархіі, ды і сярод сваіх магнатаў у яе хапала праціўнікаў. У 1790 г. Рэч Паспалітая заключыла абарончы саюз з Прусіяй; Расія на той час ваявала са Швецыяй і Турцыяй, і можна было спадзявацца, што імперыі будзе не да ўнутраных спраў суседняй краіны. Аднак Кацярына II уважліва сачыла за падзеямі ў Вільні і Варшаве, чакаючы зручнага моманту, каб "легітымна" ўвесці расійскае войска ў Рэч Паспалітую.

27 красавіка 1792 г. у Пецярбургу патаемна была створана канфедэрацыя, пазней агалошаная ў Таргавіцы. Для падтрымкі яе на мяжы Расіі з Вялікім Княствам Літоўскім (далей - ВКЛ) ужо стаялі тры карпусы расійскага войска: Ю. У. Далгарукага (Полацк), Б. П. Меліна (Талачын) і І. Я. Ферзена (Рагачоў) пад агульнай камандай генерал-аншэфа М. М. Крачэтнікава. Далгарукаў павінен быў ісці на Вільню, Мелін - на Мінск, Ферзен на Бабруйск-Слуцк-Нясвіж. У апошнім знаходзіліся значныя запасы ваеннага рыштунку, у тым ліку 106 гармат, якія Радзівілы ахвяравалі Рэчы Паспалітай, пазней 41 гармата з іх стала здабычай Ферзена[1].

Вайне 1792 г. вядомы польскі гісторык Тадэвуш Корзан, ураджэнец Мінска, прысвяціў асобны раздзел у 4-томнай гісторыі ваеннай справы ў Польшчы [2]. Найбольш дэталёва падзеі апісаны ў манаграфіі гісторыка пачатку XX ст. Адама Валанскага, напісанай на падставе рапартаў каралю Станіславу Аўгусту і ўспамінаў удзельнікаў бітвы; яна і зараз застаецца асноўнай гістарычнай публікацыяй па гэтай тэме [3].

Войска ВКЛ у 1791 г. налічвала 14792 чалавекі. Першая дывізія Юзафа Юдыцкага засталася пад Мінскам пасля асенніх манеўраў 1791 г.; перадавую стражу пад Барысавам неслі татарскі полк Беляка (617 коннікаў) і гусары кавалерыі Нарадовай (1600 чалавек).

Корпус Б. П. Меліна, узмоцнены палком брыгадзіра Л. Л. Бенігсэна, налічваў 9602 чалавекі з 13-ю палявымі гарматамі 6- і 12-фунтавага калібру (не ўлічваючы 3-фунтовых), ішоў у прынятым на той час парадку: наперадзе казакі і цяжкая кавалерыя з егерамі, затым пяхота з гарматамі, аднак і пры конніцы расіяне мелі палявыя гарматкі малога калібру. Мелін і Ферзен імкнуліся разбіць дывізію Юдыцкага і захапіць яго гарматы.

Юдыцкі, каб не быць акружаным Ферзенам з боку Слуцка, з-пад Мінска адступіў на Койданава і Стоўбцы, пераправіўся праз Нёман і 7 чэрвеня стаў лагерам каля Старога Свержаня. Тут ён даведаўся, што кароль прызначыў яго галоўнакамандуючым войскам ВКЛ і загадаў прыкрыць ад расіян Вільню і Коўна. Тадэвуш Корзан адзначаў, што прызначэнне было дрэнна ўспрынята ў войску, Юдыцкага не паважалі і не любілі, лічылі недасведчаным для такой значнай ролі. Да яго былі прысланы ў якасці дарадцаў Станіслаў Патоцкі і Томаш Ваўжэцкі, а таксама саксонскія афіцэры Клейст

і Ведэльштэт.

У лагеры не хапала намётаў, харчу, фуражу, жаўнеры аб'елі ўсё наваколле, жывіліся толькі хлебам, які палкоўнік Якуб Ясінскі прывозіў з Нясвіжа, спалі на сырой зямлі. Мала было артылерыі, а каронная не спяшалася на дапамогу. Прывезлі былі гарматы з Нясвіжа, але прыйшлося вярнуць іх назад, бо не знайшлося пад іх палявых лафетаў. Пачаліся стратэгічныя спрэчкі, недаверлівыя адносіны ў войску да камандавання.Адзін з афіцэраў пісаў у пісьме: "Не так страшны непрыяцель, як голад і сум у лагеры. Добрых шпегаў (разведчыкаў - А. Я.) не маем, нарады частыя, а без сакрэту". Юдыцкага больш за ўсё турбавала пагроза акружэння, даць рашучы бой ён ніяк не адважваўся [4].

Быў перахоплены расійскі казак-ганец з пісьмом Меліна да Ферзена аб сумесным нападзе на літоўскае войска. Юдыцкі пасля ваеннага савета вырашыў адступіць з багны і лесу на паўтары мілі да лепшай пазіцыі на бязлеснай раўніне паміж Залужжам і Мірам, "пад прыкрыццём вялікага замка, абведзенага валам і ровам", - напісаў Тадэвуш Корзан.

Каб засакрэціць гэты манеўр, у Стоўбцах Юдыцкі пакінуў татарскі полк генерала Юзафа Беляка; ён павінен быў затрымаць расіян на пераправе праз Неман. Ад вечара да позняй ночы войска Юдыцкага мяняла пазіцыю пад гукі стральбы з карабінаў над Нёманам: там ішоў бой уланаў генерала Беляка з расійскім авангардам, які працягваўся тры гадзіны. Здаецца, Бяляк разбурыў пантонны мост на лодках праз Неман, аднак расіяне знайшлі для пераправы броды.

У лаканічным дакладзе М. Крачэтнікаву пра бой на Немане Б. Мелін адзначае адважныя паводзіны ўланаў: "С сею упорствующею конницею тотчас начато сражение, переправа через реку Неман и мост вскорости отбиты и погнанный неприятель, часто останавливаясь и выстроиваясь в боевой порядок, выдерживал жестокую с лёгкими войсками и кавалериею перепалку. Наконец, будучи прогнан и преследован полторы мили, потерял множество убитых и раненых. При сем в плен взято 10 человек, да в приближении к Столбцам передовыми разъездами схвачено 30 человек, в т. ч. 6 офицеров. Преследование остановлено по причине утомления людей и лошадей, и лагерь занят при Старом Свержане» (рапарт 30 мая па ст.ст.)" [5].

Адам Валанскі падрабязна апісвае адчайную контратаку Беляка на падставе рапартаў Станіслава Патоцкага каралю і мемуараў Мікалая Сулістроўскага і падае падлікі страт Юзафам Валадковічам: забітых і раненых ліцвінаў - 40, расіян - 170 (лічбы, хутчэй за ўсё, занадта аптымістычныя, на сваю карысць).

Галоўны бой пад Мірам адбываўся на наступны дзень. Паводле падлікаў А. Валанскага агульныя суадносіны людскіх сіл праціўнікаў былі колькасна амаль роўныя: расіяне мелі значную перавагу ў пяхоце і асабліва ў артылерыі, ліцвіны - у конніцы.

Войска Юзафа Юдыцкага налічвала:

пяхоты:

1-ы рэгімент (полк) булавы вялікай - 505 чалавек;

2-і рэгімент булавы вялікай - 467 чалавек;

4-ы рэгімент Юдыцкага - 500 чалавек;

5-ы рэгімент Грабоўскага - 500 чалавек;

6-ы рэгімент Несялоўскага;

8-ы рэгімент Радзвілаў (619 і 676 чалавек).

Разам - 3782 чалавекі. У Барыса Меліна - 6340 чалавек.

Кавалерыі нарадовай (гусараў):

1-я брыгада (ковенская) - 1325 чалавек пад камандай Мікалая Сулістроўскага. Па ацэнцы сучасных гісторыкаў - адна з найгоршых у войску ВКЛ.

2-я брыгада (пяцігорская ці пінская) - 1125 чал. Камендант Твардоўскі.

Разам 2450 чалавек, у Б. Меліна - 1500.

Лёгкая конніца (два палкі пярэдняй стражы):

1-ы полк Кіркора - (ніяк не праявіўся, няясна, ці быў наогул пад Мірам);

4-ы полк генерала Юзафа Беляка (611 чал.).

Па артылерыі расійская перавага была фатальная: у Б. Мелина - 13 гармат 6- і 12-фунтавага калібру, апрача 3-фунтавых, у Юдыцкага -10 малых 3-фунтавых батальённых гармат са 111 чалавек пры іх [6]. 9 чэрвеня прыбыў з Вільні маёр Ветынгофэн з 12 гарматамі; відаць, разам з ім, як артылерыст, прыехаў Міхал Кадо, пазней стаў вядомы як прафесар архітэктуры Віленскага і Варшаўскага ўніверсітэтаў.

Генерал артылерыі Станіслаў Патоцкі пісаў у рапарце каралю пра новую пазіцыю: "Лагер стаў на ўзвышэнні, левае крыло абараняе вялізны замак, які пануе з усіх бакоў над бязмернай раўнінай, біцца трэба будзе ў чыстым полі, што не да густу казакам і башкірам, а іх шмат у Меліна" [7].

У поўнач у галоўнай кватэры Юдыцкага (няясна, дзе яна размяшчалася: у замку ці ў мястэчку? - А. Я.) была чутна перастрэлка пікетаў - расійскіх казакаў з уланамі Беляка. Генералы праводзілі працяглыя нарады, не адважваліся пачынаць актыўныя дзеянні, спасылаючыся на стомленасць і нявопытнасць літоўскага войска і ўступаючы ініцыятыву праціўніку. Бясспрэчна, расійскае войска мела значна большы вопыт, набыты ў войнах з Турцыяй і Швецыяй. Зараз нялёгка дакладна разабрацца ў сапраўдным ходзе падзей, таму што пазнейшыя рапарты розных удзельнікаў бітвы значна разыходзяцца.

На наступны дзень (11 чэрвеня) войска Юдыцкага зноў стаяла ў чаканні, генералы не адважваліся даць расіянам бой, нават вырашылі адправіць абоз у Нясвіж пад абарону замкавых гармат. Патоцкі з малым атрадам конніцы пайшоў у тым жа накірунку, наткнуўся на лагер Меліна і адступіў. Далей падзеі пайшлі самацёкам. Па словах брыгадзіра Твардоўскага, бітва "без плану пачата і скончана". Вырашальную ролю адыграла расійская артылерыя: шчыльны абстрэл разрыўнымі гранатамі з вельмі моцным гукам дэмаралізаваў нявопытных жаўнераў і распалохаў не абучаных коней.

Першай кінулася на ўцёкі кавалерыя нарадова пад камандай Патоцкага. Нават адступіць у агульным парадку войска не сумела: конніца пайшла гродзенскай дарогай, Юдыцкі з пяхотай - у бок Нясвіжа, праз Сноў у Слонім. Генерал Бяляк страціў у абозе свой шасціконны коч (карэту з адкідным верхам), у якім было 18 450 залотых польскіх, пазалочаны палаш, парадная экіпіроўка і канцылярыя дывізіі. Як камандуючы, Юдыцкі аказаўся не на вышыні, аднак асабіста вёў сябе бясстрашна, некалькі разоў стрымліваў ад панічных уцёкаў жаўнераў і фарміраваў рэшткі свайго войска, даючы адпор праціўніку [8].

Падлікі страт супраціўнікамі ў дакладах "наверх", як звычайна, супярэчлівыя. Юдыцкі налічыў сярод сваіх крыху больш за 60 чалавек, у непрыяцеля - у чатыры Разы больш. Мелін у рапарце Крачэтнікаву таксама падаў страты ліцвінаў "акруглена" - палегла на полі бою 400, узята ў палон 150.

Першая гусарская брыгада (ковенская) дробнымі

групамі праляцела праз Мір "як бура", некаторыя коннікі наогул знікалі з радоў, уцякаючы дамоў. Станіслаў Патоцкі і Тамаш Ваўжэцкі таксама заўчасна пакінулі поле бою, усё ж спрабуючы прывесці да розуму ўцекачоў. 13 чэрвеня, ужо з Гродна, Патоцкі пісаў каралю: "Значная частка конніцы праходзіла месца (Мір - А. Я.) у вялікім беспарадку і паспешна. Рабілі ўсё магчымае, каб іх стрымаць, але ў адказ цнатлівы Ваўжэцкі трапіў у такое становішча, што яму ледзь лоб не рассеклі куляй. Убачыўшы, што з гэтымі панамі няма чаго рабіць, удваіх накіраваліся ў Навагрудак па дарозе на Гродна". А. Валанскі, цытуючы Патоцкага, не без іроніі адзначае: "Сапраўды, Патоцкаму ўжо хапіла камандзірства, кананады, уражанняў і вярхом галопам памкнуў імкліва да Гродна, завяршыўшы такім чынам сваю вайсковую дзейнасць перад тварам узброенага ворага".

Меней, чым праз суткі з Гродна, лежачы ў ложку з-за моцнай фебры (ліхарадкі), Патоцкі скардзіўся ў рапарце Станіславу Аўгусту на дыскамфорт сваей язды "Наведаўшы нашу кватэру (у Міры), ужо не знайшлі сваіх экіпажаў і людзей. Спадзяваліся, што (яны) пайшлі дарогай на Гродна згодна нашай папярэдняй дамове, але верагодна ў тым замяшанні паехалі за экіпажамі Юдыцкага, які павярнуў на Нясвіж. Такім чынам засталіся без усяго". І коратка падсумаваў ход бітвы: "Праўду кажучы, некалькі гарматных стрэлаў вырашылі вынік гэтага дня, паказваючы поўную няздатнасць генерала (Юдыцкага - А. Я.) і яго дарадцаў" [9]. Характэрна, што сам дарадца і генерал артылерыі Патоцкі ні слова не напісаў пра дзеянні ў бітве пад Мірам літоўскіх артылерыстаў.

Б. П. Мелін быў незадаволены, што не ўдалося захапіць абозы (а таксама артылерыю) Юдыцкага і са спазненнем накіраваў у пагоню эстлянскіх егераў Буксгеўдэна. За імі кінуліся казакі, "заўсёды хцівыя на здабычу". Ужо ў вячэрнім змроку яны натоўпам паімчаліся па грэблі блізка да замкавага саду рабаваць Мір. На той час у Мірскім замку стаяў гарнізон з 250 жаўнераў 2-га батальёна 8-га палка Радзівілаў, створанага на аснове радзівілаўскай міліцыі, пад камандай капітана Людвіга Тэтау (Ludwig Tettau). Тэтау заўважыў праціўніка здалёк; схаваўшы сваіх жаўнераў за валамі замка, падпусціў ворага на пісталетны стрэл і даў залп на грэблі карцечамі з дзвюх гармат і з усіх флінт (накшталт паляўнічых стрэльб) сваей пяхоты. Ашаломлены праціўнік не мог вызначыць, адкуль раздаліся нечаканыя стрэлы, ад якіх на грэблі зваліліся з коней некалькі дзесяткаў казакаў. Ацалеўшыя падумалі, што былі абстраляны з-за паркану саду і здзюравілі яго кулямі, а зразумеўшы, што ліцвіны заселі дзесьці ў іншым месцы, палічылі за лепшае ўцячы. Неўзабаве капітан Тэтау заўважыў падыход галоўных сіл Меліна; не марудзячы, ён вывеў сваю пяхоту і гарматы праз тыльны выхад з замка на шлях да мястэчка, хутка дайшоў да абозаў і прыкрыў іх адыход [10]. З мястэчка паспешна вывезлі ваенныя абозы, у асноўным ацалеўшыя, страчана была нязначная частка. Мелін заняў у Міры толькі апусцелы лагер, 15 чэрвеня расіяне сталі на адпачынак ужо ў Карэлічах.

Сучаснікі бітвы і гісторыкі аднадушна сцвярджаюць, што толькі нерашучасць расійскіх генералаў, і перш за ўсё Меліна, уратавалі дывізію Юдыцкага ад горшага разгрому. "Ужо вельмі на слізкай ступені знаходзілася дывізія і напэўна была б знішчана, калі б непрыяцель хоць крыху жвавей націснуў", - пісаў Ю. Валадковіч. "Відавочная няўцямлівасць маскоўскіх генералаў пазбавіла ад канчатковай катастрофы", - дакладваў

Т. Ваўжэцкі ў рапарце каралю 16 чэрвеня 1792 г.

Сам Юзаф Юдыцкі 1 ліпеня 1792 г. папрасіў адпачынак па стану здароўя, "Слабасць, якая ўсё павялічваецца і блізка пагражае паралічом, патрабуе курацыі ў водах крэшовіцкіх". На самай справе, варта ўспомніць пра яго ўжо немалады ўзрост - каля 70 год. Тлумачэнне Юдыцкім паражэння пад Мірам змяшчае і слушныя аргументы: "супраць няспыннай непрыяцельскай кананады 12-фунтовых гранат мусіў стаць толькі з 3-фунтовымі, якія нават не дасягалі непрыяцеля. 3-за большай колькасці... ўжо акружаны з трох бакоў, распачаўшы рэйтэраду, быў пакінуты кавалерыяй, бо з аднаго крыла, дзе стаялі 8 харугваў 1-й брыгады, толькі дзве засталіся, а іншыя ўцяклі. Калі хлопы, якія цягалі гарматы, бо скарбовых вупражных да іх не было, пры першых залпах варожых гармат з коньмі паўцякалі..., у гэты час не мог знайсці ніякага авантажу(карысці, выгады - А. Я.), і ўласна засталося найбольшае тое, што войска з відавочнай згубы сумеў вывесці". Сучаснікі, крытыкі Юдыцкага, згодны, што магло стацца і горш, прыводзяць статыстыку страт на карысць войска ВКЛ.

Расійскія рапарты апісваюць бітву пад Мірам, як поўную перамогу са значнымі стратамі ў праціўніка. Б. Мелін дакладваў Крачэтнікаву, што адразу пры пераходзе граніцы пад Барысавам яго авангард узяў 10 палонных, а пад Стоўбцамі - 6 афіцэраў і 24 жаўнеры, Бяляк жа нібыта страціў "мноства забітых і раненых". Уласныя страты: забіты 1 казак, ранены 2 драгуны і 7 казакаў. Егеры быццам бы адразу занялі Мір, смаленскія драгуны дзевяць кіламетраў гналіся за Беляком. У бітве пад Мірам у непрыяцеля "загінулі да 400, узята ў палон 150; расійскія страты, апрача падстрэленых коней, 6 забітых і 21 паранены". Ацэнкі страт з супрацьлеглага боку не менш завышаныя: паводле ацэнкі Клейста і Ведэльштэта страты расіян каля 200 чалавек.

У гісторыі Мірскага замка ўсё яшчэ застаецца загадкавым час і абставіны пашкоджання паўночнаўсходняй вежы ад узрыву пораху. Найбольш вядома версія, што гэта адбылося ў чэрвені 1812 г. падчас бітвы польскіх уланаў з расійскімі казакамі. Аляксандр Ельскі ў вядомым "Слоўніку геаграфічным зямель Польскіх" пісаў, што замак пацярпеў пры штурме расійскім войскам падчас Касцюшкаўскага паўстання 1794 г. Гэты міф часам некрытычна паўтараецца да сённяшняга дня. Аднак няма ніякіх документальных звестак наогул пра ваенныя дзеянні ў 1794 г. у наваколлі Міра. Ці не пайшла легенда пра штурм замка ў 1794 ад эпізода з "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча? Тое ж трэба сказаць пра 1812 г.: бой пад Мірам быў кавалерыйскі, з нязначным удзелам артылерыі. Больш верагодным уяўляецца магчымае пашкоджанне вежы 10 чэрвеня 1792 г., калі замак сапраўды прыняў эпізадычны ўдзел у ваеннай бataліі.

Літаратура:


1. Записки Кречетникова (Дневные записки о движении и действиях войск русских в ВКЛ и Польше в 1792 г.) // Чтения Общества изучения древностей Российских. 1863. Кн. 4. С. 63.

2. Korzon, Tadeusz. Dzieje wojskowosci w dawnej Polsce. T.2. Epoka przedrozbiorowa. Lwow-Krakow-Warszawa, 1923.

3. Wolanski Adam. WojnaPolsko-Rosyjska 1792 roku. T. I—II. Krakow, 1906.

4. Wolanski Adam. Wojna Polsko-Rosyjska 1792 roku. T.I.S. 138-143.

5. Записки Кречетникова. Чтения Общества изуче-

ния древностей Российских. 1863. Кн. 4. С.48 - 49.

6. Wolanski Adam. Wojna Polsko-Rosyjska 1792 roku. T. I. S. 140

7. Wolanski Adam. Wojna Polsko-Rosyjska 1792 roku. T. I. S. 144

8. Machynia M., Rakutis V., Szrcdnicki Cz. Oficerowie Rzeczypospolitej Obojga Narodow.. Spisy: sztab. kawaleria, artyleria, wojska inzynierskie I piechota. 1772-1794. Krakow. 1999

9. Wolanski Adam. Wojna Polsko-Rosyjska 1792 roku. T. I. S. 150 і далей.

10. Wolanski Adam. Wojna Polsko-Rosvjska 1792 roku.T.I. S. 165.

11. Wolanski Adam. Wojna Polsko-Rosvjska 1792 roku.T. I. S. 162-163.



*Малюнак 1а*



*Малюнак 1б*

*1а-1б. Схемы размяшчэння войскаў напачатку і ў канцы бітвы (з рапарта Юзафа Юдыцкага каралю Станіславу Аўгусту)*



*Генерал артылеры Станіслаў Костка Патоцкі(1755-1821)*

*Томаш Ваўжэцкі(1759-1816)*





*Усходні фасад замка(фота 1970-х гг.)*